Папа пілігрым

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
07.10.2018 00:00



ІІ Ватыканскі сабор унёс неацэнны ўклад ва ўнутранае аднаўленне Касцёла. Між іншым, пасля яго змяніўся статус Святога Айца, які раней лічыўся “вязнем Ватыкана”. З таго часу біскупы Рыма вырушылі ў свет, адбываючы свае апостальскія падарожжы ў розныя краіны.

Аднойчы раніцай у пэўнай рымскай парафіі 11-гадовы хлопчык спытаўся ў Яна Паўла ІІ: “Святы Айцец, навошта Вы ўвесь час ездзіце па свеце?”. Гэтае дзіцячае пытанне, здаецца, вынікае з меркавання, што біскуп Рыма не павінен часта пакідаць Вечны Горад. А паколькі сфера паслугі Папы з’яўляецца паўсюднай, лічыцца, што Рым – гэта тое месца, дзе належыць вырашаць праблемы Паўсюднага Касцёла. † Адказ Пантыфіка быў вельмі простым: “Я так шмат ежджу, таму што не ўвесь свет знаходзіцца тут…”.

Апостальскія падарожжы вельмі неабходныя для лакальных Касцёлаў. Гэта цудоўная нагода, каб прыглядзецца да таго, чым жыве канкрэтная супольнасць і з якімі праблемамі яна сутыкаецца. Такія візіты з’яўляюцца таксама добрай падставай, каб звярнуцца да праблемы пакрыўджаных, каб заклікаць да будавання міжасобасных адносін на падмурку годнасці і праў чалавека.

Па прыкладзе сваіх папярэднікаў у свет вырушыў папа Францішак. У канцы верасня ён здзейсніў сваё 25-ае замежнае апостальскае падарожжа. На гэты раз яго прымалі ў Літве, Латвіі і Эстоніі. Падчас візіту ў гэтыя Балтыйскія краіны Святы Айцец шматразова заахвочваў тлумы вернікаў выйсці па-за ўласныя межы і адправіцца “на перыферыю, дзе заўсёды можна знайсці Езуса, прысутнага ў жыцці брата – пакутуючага, нікому не патрэбнага”.

Пасланне, якое Францішак пакінуў у Літве, вельмі важнае і красамоўнае, бо скіравана кожнаму. Мы павінны мець адвагу стаць тварам да твару з іншымі, павінны таксама памятаць, што трэба заўсёды прымаць Езуса: у Яго Слове, у Эўхарыстыі, у бедных. “Прыняць Яго, каб з’яднаў нашу памяць і спадарожнічаў на шляхах жыцця, якое маем прысвячаць служэнню іншым з радасцю, і праз гэта ўказваць, што Езус Хрыстус – наша адзіная надзея”, – сказаў Святы Айцец.

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
07.10.2018 00:00

Дарагія Чытачы!

Няхай сустрэча з папам Францішкам, якую некаторыя з нас перажылі рэальна, выехаўшы з Гродзенскай дыяцэзіі ў якасці пілігрымаў, а іншыя – пры дапамозе сродкаў масавай інфармацыі, будзе чарговай нагодай, каб запрасіць Езуса Хрыста ў сваё жыццё. Няхай яна стане – асабліва для маладых людзей – фундаментам будучыні, на якім варта будаваць далейшае жыццё. Давайце надалей спадарожнічаць Святому Айцу сваёй адданай малітвай і любячым сэрцам у яго пілігрымаванні па дарогах свету!